**АКСІЯЛО́ГІЯ** (ад грэч. axia каштоўнасць, вартасць + *..логія*), вучэнне аб каштоўнасцях, якое ахоплівае ўсе віды сац., маст. і рэліг. практыкі, чалавечую культуру ў цэлым. Тэрмін «А.» быў уведзены франц. філосафам П.Лапі (1902), але да праблем прыроды каштоўнасцей звярталіся з эпохі антычнасці. У 2-й пал. 19 ст. А. сфарміравалася як навук. дысцыпліна і стала адной з прыярытэтных у еўрап. філасофіі (Э.Гартман, Р.Г.Лотцэ, Ф.Брэнтана). Ф.Ніцшэ абвясціў патрабаванне «пераацэнкі ўсіх каштоўнасцей». У бел. філас. думцы 2-й пал. 20 ст. праблематыкай А. займаліся Я.М.Бабосаў, У.М.Конан, А.С.Майхровіч.

Існуюць розныя тэорыі тлумачэння прыроды каштоўнасцей: як уласцівую прыродзе чалавека і народжаную яго ўнутранымі імпульсамі; як грамадскае вызначэнне; як спрадвечнае каштоўнаснае вымярэнне, створанае Богам. Каштоўнасці класіфікуюць як прадметныя і суб'ектныя, віталістычныя (жыццёвыя) і духоўныя, адносныя і абсалютныя, маст., маральныя, матэрыяльныя, паліт., прававыя і інш. Іх крыніцай з'яўляюцца суадносіны з'яў з эталонам на падставе эстэтычнай, этычнай, прагматычнай ці інш. адзнакі. Кожная культура стварае сваю іерархію каштоўнасцей [прыярытэт эстэтычных уласцівы стараж.-грэч. культуры, духоўна-рэліг. — сярэдневяковай, прагматычных — буржуазнай, віталістычных (жыццёвых) — кітайскай і інш.]. У сярэдзіне 20 ст. ў працэсе дыялога культур, а таксама пошуку шляхоў прадухілення экалагічнай і ядзернай катастроф, трагічных канфліктаў і бедстваў узнікла ідэя прыярытэту агульначалавечых каштоўнасцей, надання ім статусу зыходных арыенціраў міжнар. і ўнутрыпаліт. жыцця, маральных паводзін людзей. Для бел. культуры характэрна прызнанне каштоўнасці гуманнасці, талерантнасці, працавітасці, мужнасці, жыццястойкасці, у традыц. свядомасці прыярытэт надаецца сям'і, гаспадарцы, дабрабыту.

*Літ.*: Ценностные ориентации в гуманитарном познании. Киев, 1989; К а г а н М.С. Философская теория ценности. Санкт-Петербург, 1997; Р о з о в Н.С. Ценности в проблемном мире. Новосибирск, 1998. *В.Р.Языковіч.*

**АКТ** (ад лац. actus дзеянне), частка драматычнага твора, якая характарызуецца пэўным унутраным адзінствам і закончанасцю. У спектаклі А. раздзяляюцца перапынкамі (антрактамі). У сваю чаргу А. можа дзяліцца на больш дробныя часткі (з'явы, сцэны, карціны). П'есы антычных аўтараў, драматургаў эпохі Адраджэння і класіцызму звычайна мелі 5 А. Пазней гэта правіла было парушана. У сучаснай драматургіі можна сустрэць 3- і 2-актовыя п'есы.

**АКТ** у в ы я ў л е н ч ы м  м а с т а ц т в е, выява аголенага цела чалавека; жанр выяўл. мастацтва і фатаграфіі. Прысвечаны маст. інтэрпрэтацыі аголенай мадэлі (пераважна жаночай), у выяўл. форме перадае сугучныя часу ўяўленні аб прыгажосці чалавечага цела, каштоўнасці зямных пачуццяў. Для мастака А. з'яўляецца штудыяй, практыкаваннем пры вывучэнні аголенага цела, накідам (мадэллю для будучых кампазіцый) або самаст. творам, што патрабуе валодання кампазіцыяй, перспектывай, пластычнай анатоміяй, умення перадаваць у прасторы любыя ракурсы і найскладанейшыя рухі чалавека і інш. Як выяўл. матыў А. можа быць уключаны ў вобразны кантэкст тэматычнай кампазіцыі. Выконваецца з натуры і па ўяўленні. Выявы аголенай мадэлі вядомы са старажытнасці. У 17—18 ст. набылі характар самаст. маст. задачы, пашырыліся ў якасці акадэмічных штудый. Пачынаючы з 19 ст. А. стаў у бел. мастацтве эстэтычнай нормай як самаст. жанр. У 20 ст. А. набыў адмысловую папулярнасць і ярка выяўлены творчы характар у рознай яго інтэрпрэтацыі ў бел. жывапісе і графіцы [В.Альшэўскі, Р.Заслонаў, В.Захарынскі, М.Дундзін, У.Ксяндзоў, А.Ляшчынскі, А.Тарановіч (Алесь Эротыч), У.Тоўсцік і інш.], скульптуры (Ю.Анушка, В.Борзды, А.Варвашеня, А.Жураўлёў, А.Слепаў і інш.), фатаграфіі (А.Адамчык, У.Базан, І.Барсукоў, А.Глебаў, І.Цярэнцьеў і інш.). Адначасова працягвае існаваць як частка агульнай праграмы падрыхтоўкі па маст. спецыяльнасцях у спецыялізаваных сярэдніх і вышэйшых навуч. установах Беларусі. Гл. таксама *Ню.* *М.Л.Цыбульскі.*

**АКТА́ВА** (ад лац. octava восьмая) у п а э з і і, страфа з 8 радкоў, рыфмаваных па схеме АбАбАбвв. Першыя 6, у якіх звычайна развіваецца нейкая тэма, аб'яднаны 2 перакрыжаванымі рыфмамі. Два апошнія радкі аб'яднаны сумежнай рыфмай і ўтрымліваюць афарыстычны вывад з таго, пра што гаворыцца ў 6 папярэдніх, ці ўвогуле нечаканы паварот думкі. А. ўзнікла ў італьян. нар. паэзіі, у еўрап. л-ры дасягнула росквіту ў эпоху Адраджэння. А. напісаны «Дон Жуан» Дж.Байрана, «Домік у Каломне» А.Пушкіна, «Партрэт» А.Талстога і інш. У бел. паэзіі А. сустракаецца ў Я.Купалы, М.Багдановіча, Н.Гілевіча, П.Труса, Я.Сіпакова і інш.

Як моцны рэактыў, каторы выклікае
Між строк ліста, маўляў нябожчыкаў з магіл,
Рад раньш нявідных слоў, — так цемень залівае
Зялёны, быццам лёд, халодны небасхіл,
І праз імглу яго патроху праступае
Маленькіх, мілых зор дрыжачы, срэбны пыл.
Здароў, радзімыя! Мацней, ясней гарыце
І сэрцу аб красе прыроды гаварыце!
(М.Багдановіч. «Актавы»)

**А́КТАВЫЯ КНІ́ГІ**, спецыяльныя кнігі ў судах ВКЛ і Польшчы ў 14—18 ст. У ВКЛ афіцыйна ўведзены Статутам ВКЛ 1529. Да сярэдзіны 16 ст. ўсе запісы рабіліся ў адной кнізе паводле часу паступлення спраў у суд. Паводле Статута ВКЛ 1566 зацверджаны земскі і гродскі суды з асобнымі А.к., якія падзяляліся на паточныя (запісваліся скаргі істцоў, пярэчанні адказчыкаў, данясенні судовых чыноўнікаў),

запісавыя (запісваліся акты натарыяльнага характару і афіц. дакументы — прывілеі вял. князёў, пастановы соймаў і соймікаў) і дэкрэтавыя (запісваліся судовыя пастановы, працэсуальныя дзеянні суда і бакоў). Трыбуналы, каптуровыя і інш. суды ВКЛ вялі ўласныя А.к. З'яўляюцца каштоўнай гіст. крыніцай. Асн. фонд А.к. Беларусі зберагаецца ў Нац. гіст. архіве Беларусі ў Мінску.

**АКТО́ІХ**, асмагласнік, адна з галоўных богаслужэбных кніг праваслаўнай царквы, якая змяшчае паслядоўнае выкладанне песнапенняў васьмі гласаў. Існуе ў простым (ненатаваным) і пеўчым (натаваным, нотным) відах. Музыка выкладаецца крукавой, квадратнай, лінейнай і сучаснай натацыямі. А. больш ярка, чым інш. богаслужэбныя кнігі, адлюстроўваюць найважнейшыя заканамернасці структурнай арганізацыі сістэмы асмагласся. Ненатаваны рукапісны А. бярэ пачатак у візант. традыцыі выконваць песнапенні ў кожны з 8 дзён Пасхі на асобы глас. У пач. 6 ст. з святочных гімнаў, сгрупаваных па 8 гласаў, сірыйскім патрыярхам Севірам быў складзены збор песень «Актоіх». Аўтарамі песнапенняў А. былі царк. гімнографы 8—13 ст. Іаан Дамаскін, Феадор Студыт, Іосіф Песнапісец і інш. Натаваныя рукапісныя А. з'явіліся ў канцы 16 ст. З гэтага часу на землях ВКЛ пачалося выданне А., якія выходзілі з друкарняў Вільні (Васіля Гарабурды, 1582), Магілёва (Спірыдона Собаля, пасля 1638; брацкай, 1730, 1740, 1754), Куцейна (Собаля, каля 1632; Богаяўленскага манастыра, 1646), перадрукоўваліся і перапісваліся на працягу 17—20 ст., у т.л. ў стараабрадніцкім асяроддзі (у Ветцы). На сённяшні час ненатаваныя і натаваныя А., напісаныя і надрукаваныя ў перыяд ВКЛ і больш позні час, захоўваюцца ў шматлікіх бел., рас., літоўскіх, польск. і інш. музейных і бібліятэчных фондах. Самыя вял. зборы А. у Беларусі (каля 70 кніг, у т.л. ў пераплёце з інш. кнігамі) у Нац. б-цы Беларусі, Цэнтр. навук. б-цы НАН Беларусі, Веткаўскім музеі нар. творчасці.

*Літ.*: Пікарда Г. дэ. Царкоўная музыка на Беларусі, 989—1995. Мінск, 1995; Гусейнова З.М. Октоих нотированный: (по материалам рукописей XV—XVII вв.) // Дни славянской письменности и культуры: материалы Всерос. конф. Владивосток, 1998. Ч. 1; Дожына Н. Спеўная кніга Актоіх на Беларусі // Музычная культура Беларусі: пошукі і знаходкі: матэрыялы VII навук. чытанняў памяці Л.С.Мухарынскай, Мінск, 8—10 крас. 1998 г. Мінск, 1998; Яе ж. Состав и редакции певческой книги Октоих на примере трех старообрядческих кодексов из минских собраний // Вопросы музыкознания и философии музыки. Минск, 2003; Бражников М.В. Русская певческая палеография. Санкт-Петербург, 2002.

*Н.І.Дожына.*

**АКТУА́ЛЬНАЕ МАСТА́ЦТВА** (англ. actual art), наватарскае сучаснае мастацтва ў плане ідэй або тэхн. сродкаў; сукупнасць найноўшых маст. практык арыентаваных на мясцовы і міжнар. маст. працэс і кантэкст. Тэрмін часам выкарыстоўваецца ў якасці сіноніма тэрміна «сучаснае мастацтва», але не тоесны яму па сэнсе (сучаснае мастацтва не абавязкова актуальнае). Уключае творы розных відаў і жанраў, матэрыяльныя аб'екты з розных матэрыялаў, жэсты, сітуацыі, інтанацыі і інш. Пазіцыяніруе яркае, свежае, надзённае, кангеніяльнае (падобнае па складзе, маст. манеры і інш.) мастацтва, якое разбурае стэрэатыпы і з'яўляецца адным з вядучых кірункаў сусв. маст. працэсу. Па характары А.м. вельмі актыўнае, радыкальнае,

*Актоіх: 1 — Куцейна. 1646. Тытульны ліст; 2 — Ветка. Пач. 19 ст. Аркуш 124; 3 — Ветка. 1824. Тытульны ліст.*

1



2



3

